## STALIN KAPUTT!*

Дажджлівая восеньская раніца. Я іду па вуліцы на ўскраіне гораду й раптам бачу наступную карціну. На скрыжаваньні вулак стаіць звычайная тумбачка, мэтраў за дзесяць ад яе прыгнуліся ад холаду й дажджу нямецкі салдат і два паліцаі. На дзьверцы тумбачкі неахайна напісана чорнай фарбаю: *Stalin kaputt!*, ніжэй — вялізныя літары *ГМВ*. Мінакоў амаль не было. Заінтрыгаваны, я азірнуўся па баках і зайшоў у вуглавы дом, дзе жыве мой знаёмы мастак, удзельнік падпольнага руху Ігар *Z*. Усё, што адбывалася потым, я назіраў з вакна дома *Z*.

Было бачна, што немец і паліцаі кагосьці чакалі. Неўзабаве да іх падышлі маёр Шэйман з камэндатуры й высокі паліцай з рудымі вусамі. Маёр штосьці сказаў астатнім і хуценька адышоў ад тумбачкі мэтраў на 30. За ім адбег і другі немец. Адзін з паліцаяў нахіліўся й паспрабаваў адчыніць дзьверку таямнічай тумбачкі. Адчынілася яна не адразу, але як толькі... Моцны выбух адкінуў нас ад вакна. Я выйшаў з дому й праз гароды хутка сышоў.

У тую восень аж да самага Новага году ў розных мясцінах гораду зьявілася яшчэ каля двух дзясяткаў такіх вясёлых тумбачак. Адну зь іх знайшлі на досьвітку нават на плошчы перад камэндатураю. На некаторых тумбачках ляжалі якія-небудзь “падарункі”: пляшка гарэлкі “Белая Гусь”, напрыклад, альбо далікатэсная рыба піраноя, якую гадавалі ў вадасховішчы Дразды за Менскам для кухні самога генэральнага камісара (на левым баку гэтае рыбы, падобнай да ляшча, узор на лусцы нагадвае чорную зорку, а на правым — чырвоную свастыку).

Бомбы ў тумбачках былі зладжаныя такім чынам, што выбухалі нават ад нязначнага зруху. У горадзе ўсе толькі й гаварылі пра іх ды пра таямнічы подпіс *ГМВ*. Дзіўна, але я ўсю восень ня ведаў, хто быў аўтарам гэтых “інсталяцыяў”. І толькі на сьвяткаваньні Новага году ў адной партызанскай брыгадзе я, нарэшце, даведаўся імёны тых герояў-жартаўнікоў.

Высьветлілася, што двух з патрыётаў, якія трымалі ў жаху сваімі тумбачкамі ўсіх фашыстаў гораду, я ўжо добра ведаў. Гэта былі Міхал Крошнер (кампазытар, аўтар славутых “Беларускіх сымфанічных танцаў”, а цяпер — гаспадар сеткі мэбляваных явачных кватэраў) і колішні саліст Опэрнага тэатру Ізраіль Балотны. Перад вайною яны былі, можна сказаць, кумірамі менскіх тэатралаў.

Пазнаёмілі мяне й з вынаходнікам “тумбачкі з сакрэтам” Хаімам Суціным. Гэты вельмі прывабны рудаваты чалавек зь вялікім пачуцьцём гумару да вайны працаваў у мясанарыхтоўчай канторы ў Сьмілавічах. У брыгадзе іх называлі ня йнакш як Гог, Магог і Вангог. Ізя сказаў, што гэта ён прапанаваў так іх называць. Партызаны ў бальшыні сваёй былі, канечне, людзі простыя і ня ведалі, што значаць гэтыя нетутэйшыя імёны. Дый не было ў іх часу задумвацца пра такія рэчы.

Ва ўсёй той задуме з тумбачкамі было штосьці карнавальнае — напачатку сьмешнае, а потым жудаснае. Літары *ГМВ* яшчэ не аднойчы зьяўляліся на сьценах акупаванага гораду як магічны сымбаль помсты, як назва таямнічага выдавецтва на цагляных кнігах лёсаў.

---

**У тэксьце скарыстаныя матывы апавяданьня мастака Ігара Цішына “Гог и Магог”.*